# МОЎНЫ РЭЖЫМ БЕЛАРУСКІХ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛ БССР У СЯРЭДЗІНЕ-КАНЦЫ 1930-Х ГГ.

М.К. Альховік
БДМУ (Мінск)

У беларускай гістарыяграфіі вектар культурна-моўнай палітыкі ЦК КП(б)Б з сярэдзны 1930-х гг. ацэньваецца як накіраваны на цэнтралізацыю і ўніфікацыю нацыянальнай сферы, на згортванне беларусізацыі і работы сярод нацыянальных меншасцей [5, с. 147-148; 7, с. 77; 1, с. 195-196]. Пры гэтым асобныя даследчыкі інтэрпрэтуюць факты захавання колькаснай перавагі беларускіх школ, тэатраў, друку і занепакоенасці ўлад недастатковымі тэмпамі вылучэння беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады як сведчанне таго, што ў сярэдзіне 1930-х – пачатку 1940-х гг. ЦК КП(б)Б не адмовіўся ад усіх здабыткаў беларусізацыі [31; 30, с. 96]. Адначасова адсутнічае дакладны адказ на пытанне, ці захоўваўся моўны рэжым ў беларускіх школах.

З пачатку 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай работы ў БССР з'яўлялася беларусізацыя, накіраваная на пераадоленне наступстваў русіфікацыі, забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і культуры ў БССР і трансфармацыю беларускай «буржуазнай» нацыі ў «сацыялістычную». Гэта палітыка прадугледжвала абслугоўванне тытульнага насельніцтва на роднай мове, вылучэнне беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады, будаўніцтва беларускай сацыялістычнай культуры, захады па ўзмацненні нацыянальнай самасвядомасці і стварэнні колькаснай перавагі беларусаў у складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі. У канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. беларускія школы ў БССР складалі каля 90% ад агульнага ліку школ, пры гэтым былі пераадолены масавыя выпадкі выкарыстання рускай (у асобных раёнах – украінскай) мовы ў працэсе навучання і выхавання [24, с. 19].

Згортванне беларусізацыі пачалося пасля прыняцця пастаноў ЦК УКП(б) «Аб сельскагаспадарчых нарыхтоўках у Беларусі» ад 19 снежня 1932 г. і «Аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі УКП(б) у Беларусі» ад 2 сакавіка 1933 г., у якіх партыйна-савецкія работнікі БССР былі абвінавачаны ў ажыццяўленні «гвалтоўнай беларусізацыі» [32, с. 702-703]. Успрыняўшы рашэнні ЦК УКП(б) як сігнал аб згортванні беларусізацыі і асцерагаючыся абвінавачванняў у беларускім нацыяналізме, работнікі дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, выкладчыкі і студэнты ВНУ, ССНУ, ВТНУ, рабфакаў адмовіліся ад выкарыстання беларускай мовы. Настаўнікі беларускіх школ рыхталіся на рускай мове і пачыналі выкарыстоўваць беларускую мову толькі на практычнай рабоце ў школе. Студэнты Горацкага сельскагаспадарчага інстытута тлумачылі неўжыванне беларускай мовы наступным чынам: «хочаце, каб вас не звалі нацдэмамі, не вывучайце беларускай мовы» [9, арк. 113-115].

У канцы 1930-х гг. работнікі і грамадскія актывісты былі вызвалены ад неабходнасці валодання беларускай мовай [15, арк. 369, 365], а палітыка

беларусізацыі пераўтварылася ў аб’ект жорсткай крытыкі як накіраваная на падрыў пазіцый рускай мовы ў адукацыі, друку, мастацкай літаратуры, драматургіі і г.д., насаджэнне беларускай мовы ў мэтах падзелу працоўных па нацыянальнай прыкмеце і прапаганды «нацдэмаўскіх ідэй»: «руская мова… была забаронена, забаранялася гаварыць і пісаць на рускай мове, найменшае супраціўленне гэтаму каралася і работнікі выганяліся…» [14, арк. 28; 4, с. 85-87; 29, с. 78; 26]. У 1938 г. у Мінскім педагагічным інстытуце народны камісар асветы БССР У.І. Півавараў заявіў, што «руская мова – гэта асноўная дзяржаўная мова, беларуская і яўрэйская – гэта другарадныя» [19, арк. 250]. 9 кастрычніка 1938 г. Бюро ЦК КП(б)Б пацвердзіла выключэнне з УКП(б) работніка НКА БССР І.М. Мазура за працягванне «нацдэмаўскай устаноўкі Баліцкага, Ігнатоўскага, Прышчэпава, Лёсіка і інш.» у школьнай літаратуры і ігнараванне рускай мовы ў адукацыі. 22 чэрвеня 1941 г. І.М. Мазур быў арыштаваны [17, арк. 21-21 зв.].

У сярэдзіне-канцы 1930-х гг. беларускія школы былі аб’яўлены «засмечанымі шпіёнамі» і «нацыяналістамі», якія зрываюць выкладанне рускай мовы [27], а падручнікі і навучальныя праграмы – «нацыяналістычным хламам» [2]. Беларуская школа функцыянавала ва ўмовах недахопу ці адсутнасці беларускіх падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў, пераводу работы аддзелаў народнай адукацыі, педагагічных нарад і канферэнцый на рускую мову. У 1935 г. доля падручнікаў і дапаможнікаў на рускай мове склала 13,3-16,1%, у 1938 г. – 34,3%, у 1940 г. – больш за 40%, г.зн. яны дастаўляліся і ў нярускія школы [16, арк. 99, 106; 11, арк. 186-187; 22, арк. 6].

У 1933 г. пры адсутнасці рэакцыі партыйных, прафсаюзных арганізацый, аддзелаў народнай адукацыі пачаўся перавод беларускіх школ на рускую мову. У прыватнасці, на рускую мову былі пераведзены педагагічны працэс, дакументацыя, сходы педагагічнага калектыва ў 3, 13, 23, 37 і інш. школах Мінска, СШ № 2 Магілёва, СШ № 1 Быхава, СШ № 3 Гомеля, Саладухінскай СШ Мехаўскага раёна Віцебскай вобласці, большасці школ Аршанскага чыгуначнага вузла. ЦК КП(б)Б не прарэагаваў на паведамленне газеты «Рабочий» ад 19 чэрвеня 1935 г. аб парушэнні моўнага рэжыму ў шэрагу беларускіх школ Віцебска [10, арк. 85]. Былі выяўлены выпадкі выкладання асобных прадметаў на рускай мове, выкарыстання рускай мовы ў рабоце педагагічнага калектыва ў 2, 6, 15, 19, 21, 33 школах Мінска, 1, 3, 4, 5, 9, 11 школах Барысава, 2 і 7 школах Оршы, 3 школе Быхава, 11 і інш. школах Магілёва, асобных школах Віцебска і Гомеля. У СШ № 11 і інш. школах Магілёва, у большасці беларускіх СШ Мінска навучанне ў 1-4 класах адбывалася на беларускай мове, у 5-6 класах – на беларускай і рускай мовах, у 7-10 класах – на рускай. У СШ № 25 Мінска, СШ № 1 Добруша, Гадзілаўскай пачатковай школе Рагачоўскага раёна навучальны працэс адбываўся на руска-беларускай мове [23, арк. 10; 10, арк. 85; 12, арк. 30]. У многіх школах панавала змешаная гаворка, на старонках насценгазет, дошках аб’яў утрымлівалася вялікая колькасць памылак, педагогі нярэдка не заўважалі свае памылкі і памылкі вучняў [12, арк. 30; 28; 25; 3]. У 1937 г. начальнік Аддзела тэхнічных умоў УДБ НКУС БССР Урачаў прызнаў «нездаровую тэндэнцыю з

боку настаўнікаў беларускай мовы, асабліва на перыферыі, пакідаць сваю спецыяльнасць і пераключацца на работу на рускай мове» [13, арк. 8].

21 лістапада 1938 г. П.К. Панамарэнка ў лісце да І.В. Сталіна адзначыў, што кіраўніцтва БССР захоўвае курс на паступовае павелічэнне сеткі рускіх школ. Аднамомантавая рэарганізацыя беларускіх школ у рускія прызнавалася «практычна мэтазгоднай, але палітычна недапушчальнай» [18, арк. 18-29]. 29 лістапада 1938 г. народны камісар асветы БССР Е. Уралава і загадчык аддзела школ ЦК КП(б)Б К. Кісялёў задаволілі хадайніцтва НКУС БССР аб рэарганізацыі ў рускія 2-х беларускіх НСШ пры працоўных калоніях НКУС БССР для непаўнагадовых правапарушальнікаў у Віцебску і Магілёве, якія пераважна камплектаваліся за кошт асуджаных па-за межамі БССР [20, арк. 179-180]. 1 ліпеня 1939 г. Е. Уралава ў сувязі з узмацненнем папулярнасці рускіх школ у насельніцтве прапанавала П.К. Панамарэнку даць «ясную ўстаноўку ў галіне планавання прыёму дзяцей». У жніўні 1939 г. Бюро ЦК КП(б)Б пачало задавальняць хадайніцтвы аб рэарганізацыі беларускіх школ у рускія (15 НСШ у Полацку і інш.) За восем месяцаў 1939 г. доля беларускіх школ зменшылася з 96,75 да 94,33%, вучняў у беларускіх школах – з 93,4% да 88%. Напаўняльнасць рускіх школ у гарадах перавысіла адпаведны паказчык беларускіх школ. У верасні 1938 г. у Мінску налічвалася 30 беларускіх і 14 рускіх школ, у верасні 1939 г. – 27 і 16 (колькасць вучняў 14757 і 16385 адпаведна). У верасні 1939 г. у Віцебску ў 15 рускіх школах навучалася 8327 вучняў, у 26 беларускіх школах – 11 754 [6, с. 24; 21, арк. 167, 172, 168; 8, с. 119-120].

Такім чынам, працэс выцяснення беларускай мовы з усіх сфер дзяржаўнага і грамадскага жыцця заканамерна адбіўся на моўным рэжыме беларускай агульнаадукацыйнай школы. У сярэдзіне 1930-х гг. пачаўся пераклад навучальна-выхаваўчага працэсу беларускіх школ на рускую мову, у лістападзе 1938 – жніўні 1939 гг. пачалася афіцыйная рэарганізацыя беларускіх школ у рускія.

Літаратура


1. Андрэева, Е.Г. Гісторыя народнай адукацыі Беларусі (1917-1941) / Е.Г. Андрэева. – Мінск : НПТАА "Піан", 2001. – 319 с.
2. Диманштейн, С. Большевистский отпор национализму / С. Диманштейн // Революция и национальности. – 1933. – № 4. – С. 1-13.
3. Зельцэр, І. Аб выкладанні літаратуры ў школах БССР / І. Зельцэр. – Літаратура і мастацтва. – 1938. – 6 сак. – С. 3.
4. Илькевич, Н.Н. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР : / Н. Н. Илькевич, Р. П. Платонов. – Минск : БелНИИДАД, 1997. – 99 с.
5. Касцюк, М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М.П. Касцюк. – Мінск : «Экаперспектыва», 2000. – 308 с.
6. Культурное строительство БССР: Стат. справ. – Минск : Изд. Управления Народнохозяйственного учета Белорусской ССР, 1940. – 112 с.
7. Лыч, Л.М. Міжваенная беларусізацыя і яе ўрокі / Л.М. Лыч. – Мінск: б. в., 2014. - 233 с.

8. Минская область в документах и материалах. Вып. 1. Январь 1938 г. – июнь 1941 г. / сост. Н.В. Дружбина и др. – Минск : НАРБ, 2007. – 240 с.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ)

9. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7184.
10. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7741.
11. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7753.
12. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10682.
13. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12055
14. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12308.
15. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12309.
16. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12373.
17. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12471.
18. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13201.
19. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13225.
20. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13233.
21. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13267.
22. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 15624.
23. Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 18446.
24. Некрашэвіч, А. XVI з’езд КП(б)Б аб нацыянальным пытаньні / А. Некрашэвіч // Партыйны работнік. – 1930. – № 12-13. – С. 19-25.
25. Нортман, С. Добра ведаюць літаратуру // Чырвоная змена. – 1938. – 24 мая. – С. 3.
26. Піваварaў, В. Руская мова ў школах БССР / В. Піваварaў // Звязда. – 1938. – 1 крас. – С. 3.
27. Пятроўская. Не бачаць сапраўднасці / Пятроўская // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1937. – № 17. – С. 4.
28. Саломка, А. Настаўнікі адказваюць за граматнасць вучняў / А. Саломка // Звязда. – 1939. – 10 студз. – С. 3.
29. Савецкая Беларусь / пад рэд. В. В. Бедзіна, Ів. Шапавалава і М. Т. Лынькова : ДВБ, Аддзел палітычнай літаратуры. – Менск : ДВБ, 1938. – 92 с.
30. Старовойтов, М.И. Научно-педагогическая и творческая интеллигенция белорусско-украинского пограничья в условиях белорусизации и украинизации: этнокультурный аспект / М.И. Старовойтов // Известия Гомельского гос. унив. имени Ф. Скорины. – 2012. – № 4. – С. 95-103.
31. Хромченко, Д.Н. К вопросу о сроках и характере белорусизации в БССР в 1920-1930-е гг. // Сборник научных трудов сотр. кафедры "История, мировая и отечественная культура". - Минск: БНТУ, 2014. – С. 169-179.
32. ЦК РКП(б) – ВКП(б) и национальный вопрос / сост. Л.С. Гатагова, Л.П. Кошелева, Л.А. Роговая. – М., 2005. — Кн. 1. : 1933-1945. – 784 с.